Крыніца: adu.by Нацыянальны інстытут развіцця адукацыі

**Дэма-версія практычнага задання для экзамена па гісторыі Беларусі, для навучэнцаў 9-х класаў (2022/2023 навучальны год). Білет 6. Варыянт 2**

## Білет 6. Практычнае заданне. Грамадска - палітычнае жыццё ў БССР у другой палове 1940 - 1980 - я гг.

**Аўтар заданняў:**Іваноў А.М. настаўнік гісторыі ДУА «Сярэдняя школа №3 г. Оршы імя У.С. Караткевіча»

**Выкарыстоўваючы прадстаўленыя матэрыялы, адкажыце на пытанні:**
1. Якая з прадстаўленых крыніц заканадаўча замацоўвала кіруючую ролю Камуністычнай партыі Беларусі (КПБ)?
2. Вызначыце, у чым заключалася кіруючая роля КПБ?
3. Прааналізуйце дынаміку змянення колькасці членаў КПБ. Чым можна растлумачыць паскарэнне росту колькасці сяброў КПБ у канцы 1970 - пачатку 1980-х гг.?
4. У якой меры грамадзяне БССР маглі рэалізаваць свае права на кіраванне дзяржавай і ўдзельнічаць у грамадска-палітычным жыцці. Пацвердзіце сваё меркаванне.

**Крыніца 1**
**Канстытуцыя БССР 1978 г.**

Артыкул 1. Беларуская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка ёсць сацыялістычная агульнанародная дзяржава, якая выражае волю і інтарэсы рабочых, сялян і інтэлігенцыі, працоўных рэспублікі ўсіх нацыянальнасцей.

Артыкул 2. Уся ўлада ў Беларускай ССР належыць народу. Народ ажыццяўляе дзяржаўную ўладу праз Саветы народных дэпутатаў, якія складаюць палітычную аснову Беларускай ССР.

Артыкул 6. Кіруючай і накіроўваючай сілай савецкага грамадства, ядром яго палітычнай сістэмы, дзяржаўных і грамадскіх арганізацый з'яўляецца Камуністычная партыя Савецкага Саюза. КПСС існуе для народа і служыць народу.

Узброеная марксісцка-ленінскім вучэннем, Камуністычная партыя вызначае генеральную перспектыву развіцця грамадства, лінію ўнутранай і знешняй палітыкі СССР; кіруе вялікай стваральнай дзейнасцю савецкага народа, надае планамерны, навукова абгрунтаваны характар ягонай барацьбе за перамогу камунізму.

Артыкул 7. Прафесійныя саюзы, Усесаюзны Ленінскі Камуністычны Саюз Моладзі, кааператыўныя і іншыя грамадскія арганізацыі ў адпаведнасці са сваімі статутнымі задачамі ўдзельнічаюць у кіраванні дзяржаўнымі і грамадскімі справамі, у вырашэнні палітычных, гаспадарчых і сацыяльна-культурных пытанняў.

Крыніца: adu.by Нацыянальны інстытут развіцця адукацыі

Артыкул 97. Вышэйшым пастаянна дзеючым органам дзяржаўнай улады Беларускай ССР з'яўляецца Вярхоўны Савет Беларускай ССР.

Артыкул 115. Савет Міністраў Беларускай ССР - Урад Беларускай ССР - з'яўляецца вышэйшым выканаўчым і распарадчым органам дзяржаўнай улады Беларускай ССР.

Артыкул 116. Савет Міністраў Беларускай ССР утвараецца Вярхоўным Саветам Беларускай ССР

Артыкул 124. Органамі дзяржаўнай улады ў абласцях, раёнах, гарадах, раёнах у гарадах, пасёлках, сельскіх населеных пунктах з'яўляюцца адпаведныя Саветы народных дэпутатаў.

**Крыніца 2**




**Крыніца 3. Салаўёў, М. Рады працоўных - сапраўдныя органы ўлады ў нашай краіне! 1959 г.**

